# ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЕ І ДУХОЎНАЕ БААЯВАННЕ: ДВА СВЯТЫ РОДНАЙ МОВЫ



**Што такое Дзень пісьменства? У шырокім сэнсе – баляванне. Інтэлектуальнае, духоўнае і літаратурнае – дэлегацыя Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі змагла ў гэтым пераканацца.**

Вядома ж, на Свяце пісьменства ў Слоніме «галоўнай стравай» для магілёўцаў стала іх выступленне з праграмай «Я – часцінка маёй Беларусі» на пляцоўцы «Слова пісьменніка».

Пытанне ж, што найбольш цікавіла магілёўскіх пісьменнікаў, гучала наступным чынам: што ёсць малая радзіма?

Напрыклад, старшыня Магілёўскага аддзялення Алесь Казека ў сваім выступленні паказаў Радзіму як маці, песню, слова – нешта неаддзельнае ад кожнага чалавека. Паэт Уладзімір Ясеў звярнуў увагу слухачоў на шматграннасць родных мясцін. У вершах Жанны Усцінавай малая радзіма паўстала як трохкутнік паміж трыма вёскамі Магілёўшчыны, аб'яднанымі лініямі лёсу паэткі. Алёна Беланожка ўспомніла пра лясныя сцяжынкі і пра непаўторныя брусвічныя россыпы на палянах. А Алена Кісель адмовілася ад звыклай містыкі і антычнай міфалогіі і прызналася, што бачыць Магілёў увасабленнем казкі.

Магілёўскі паэт і кампазітар Мікалай Яцкоў прэзентаваў на пляцоўцы верш, які быў ім напісаны ўпрост па дарозе з Магілёва ў Слонім і адрэдагаваны ўсімі членамі дружнай творчай дэлегацыі:

*Магілёўскія гоні*
*Развінуліся шляхам.*
*А мы едзем у Слонім,*
*Мы ляцім, нібы птахі*
*Ды сардэчных размоў*
*Пра карэнне й вытокі,*
*Ды галактыкі слоў*
*Беларускіх, высокіх,*
*Што стаяць, нібы ўслоны,*
*Дзе Пісьменства памежжа...*
*А мы едзем у Слонім,*
*Ды Сапегавай вежы.*
*Дзе гісторыі скроні*
*Засівеліся чынна...*
*А мы едзем у Слонім –*
*Ды сябе, ды Айчыны.*

Вершаваныя радкі з подпісамі ўсіх членаў дэлегацыі былі змешчаны пад шкло і перададзены аддзелу ідэалагічнай работы Слонімскага райвыканкама – на добрую памяць. І – як мімавольны напамінак пра тое, што сёлета эстафета перайшла да Магілёўскай вобласці, і наступны Дзень беларускага пісьменства будзе святкавацца ў г. Бялынічы. Так што – можна пачынаць закрэсліваць дні календара: новае баляванне літаратуры не так ужо і далёка!

Але магілёўскія пісьменнікі вырашылі не чакаць цэлы год. І ўжо праз тыдзень, пад уражаннем свайго ўдзелу ў імпрэзах у Слоніме, арганізавалі мясцовае невялічкае Свята беларускай мовы. Магілёўская суполка Саюза пісьменнікаў Беларусі зладзіла незвычайную літаратурную гасцёўню «Магія слова». Сустрэча прайшла ў Магілёўскай абласной бібліятэцы. Гасцінна і яскрава прадставіла ўдзельнікам мерапрыемства стэнд-прэзентацыю выданняў на роднай мове самай рознай тэматыкі і аўтараў загадчык аддзела бібліятэкі Наталля Багданава. Падтрымліваў святочны настрой народны ансамбль народнай музыкі «Магілёўцы» Магілёўскага абласнога Цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы.

Удзельнікі-выступоўцы не толькі чыталі свае творы, але і распавялі пра свае шляхі да беларускасці, пра важнасць захавання і папулярызацыі роднай мовы, разважалі пра беларускую літаратуру – яе сучасны стан і здабыткі. У імпрэзе ўзялі ўдзел старшыня абласнога аддзялення СПБ Алесь Казека, члены СПБ: прарэктар МДУ імя. А.Куляшова Уладзімір Ясеў, празаік Віктар Арцемьеў, паэтэса Марына Сліўко, паэт Уладзіслаў Кавалёў. Прысутным цікава было паслухаць выступленне кандыдата філалагічных навук Марыны Чмаравай. На імпрэзе выступілі маладыя літаратары і члены літаратурнага аб'яднання «Ветэран».

Напрыканцы мерапрыемства ў выкананні магілёўскага паэта і кампазітара Мікалая Яцкова ўпершыню прагучала песня «Беларусь мая родная» (муз. М.Яцкова, сл. А.Казекі).

***Алена КІСЕЛЬ,***
***член Саюза пісьменнікаў Беларусі.***